Partnership for Good Governance

COUNCIL OF EUROPE

EUROPEAN UNION

CONSEIL DE L'EUROPE

**У Мінску былі прадстаўлены вынікі сумесных беларуска-еўрапейскіх праектаў**

Страсбург/Мінск, 9 лістапада 2017 года: Цягам 2015-2017 гадоў Еўрапейскі Саюз (ЕС) і Савет Еўропы праводзілі тры краіна-арыентаваных праекты ў Беларусі. Вынікі гэтых праектаў з агульным бюджэтам у 200 000 еўра былі сёння прадстаўлены супрацоўнікам СМІ ў Мінску.

Беларусь таксама ўдзельнічала ў 14 рэгіянальных ініцыятываў, якія ахопліваюць усе краіны Усходняга партнёрства. Праекты фінансаваліся ЕС і ажыццяўляліся Саветам Еўропы.

Сярод асноўных вынікаў выкананых краіна-арыентаваных праектаў наступныя:

- У супрацоўніцтве з беларускімі ўладамі, юрысты і прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў вызначылі мерапрыемствы **па абароне традыцыйна выкарыстоўваемых моў нацыянальных меншасцяў у Беларусі** як часткі культурнай спадчыны краіны. Мерапрыемствы па павышэнню дасведчанасці былі накіраваны каб заахвоціць бацькоў аддаваць сваіх дзяцей у школы з выкладаннем моваў меншасцяў. Асноўная мэта праекта была ў тым, каб дапамагчы ўладам вывучыць прававыя сцэнары магчымага далучэння краіны да Еўрапейскай хартыі рэгіянальных моў і моў меншасцяў;
- Праект па пытаннях **эфектыўнага кіравання** спрыяў больш дакладнай ацэнцы рызык адмывання грошай і фінансавання тэрарызму, а таксама паляпшэнню расследавання эканамічных злачынстваў. Пракуроры, следчыя і службовыя асобы з 17 устаноў дзяржаўнага сектара навучыліся больш эфектыўна ажыццяўляць ацэнку рызыкі карупцыі. Праваахоўныя органы навучыліся як ажыццяўляць нядаўна ўведзеныя адміністрацыйныя санкцыі, звязаныя з адказнасцю юрыдычных асоб у карупцыйных справах;
- Беларускія юрысты і супрацоўнікі праваахоўных органаў, а таксама студэнты права і міжнародных адносін атрымалі веды аб **еўрапейскай сістэме абароны правоў чалавека**, у тым ліку прэцэдэнтнага права Еўрапейскага суда па правах чалавека (ЕСПЧ). Курс дыстанцыйнага навучання мусіць быць уведзены ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў рамках Еўрапейскай праграмы па адукацыі ў галіне правоў чалавека для спецыялістаў юрыдычных прафесій.

*У красавіку 2014 года Еўрапейскі Саюз і Савет Еўропы дамовіліся аб рэалізацыі мэтавай супрацоўніцкай дзейнасці з краінамі Усходняга партнёрства ЕС, каб наблізіць іх да еўрапейскіх стандартаў у галіне правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства закона. Усходняе партнёрства ахоплівае шэсць краін: Азербайджан, Арменію, Грузію, Малдову, Украіну і Беларусь. Усе яны, акрамя Беларусі, з'яўляюцца дзяржавамі-сябрамі Савета Еўропы.*